**Уладзімір Калаткоў**
(Мінск)

# Маракі-беларусы Балтыйскага флоту ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху 1917–1918 гг.

У 1957 г. да 40-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў перыядычным друку БССР апублікаваны былі кароткія ўспаміны пра рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. былога матроса-балтыйца Васіля Мухі[1]. Ва ўспамінах іх аўтар паўстае як прыхільнік бальшавізму і ўстанаўлення савецкай улады ў Беларусі. Між тым у сапраўднасці ў перадапошні год сваёй тэрміновай ваеннай службы на расійскім Балтыйскім флоце Васіль Муха, перш чым далучыўся да бальшавікоў, актыўна ўключыўся ў беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, з’яўляўся па сутнасці яго пачынальнікам на дадзеным флоце. Аднак пра гэта ва ўмовах палітычных рэалій савецкага грамадства адкрыта гаварыць не даводзілася, каб не быць абвінавачаным у нацыяналізме і антысавецкай дзейнасці. Акрамя В. Мухі былі і іншыя актывісты беларускага руху на Балтыйскім флоце.

Пад беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам у цяперашні час прынята лічыць „грамадскі рух за вызваленне беларускага народа з-пад каланіяльнага ўціску, нацыянальнае адраджэнне беларусаў, за іх самастойнае свабоднае развіццё на аснове

[1] В. Л. Муха, *У слаўным семнаццатым*, „Чырвоная змена”, 1957, 3 лютага; яго ж, *Шлях у рэволюцыю*, „Магілеўская праўда”, 1957, 16 кастрычніка.

сваёй дзяржаўнасці, здзяйсненне ўласнай суб'ектна-творчай ролі ў агульначалавечай цывілізацыі"[2]. Як і рух іншых народаў былой Расійскай Імперыі, беларускі нацыянальна-вызваленчы рух актывізаваўся пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. У кароткі час на тэрыторыі Беларусі, а таксама ў Петраградзе, Маскве і іншых расійскіх гарадах, дзе было нямала беларусаў-бежанцаў, рабочых, салдат і матросаў, узнікла мноства нацыянальных арганізацый, гурткоў, зямляцтваў.

Практычна адначасова з утварэннем першых гурткоў беларусаў-вайскоўцаў, якія паўсталі ў маі 1917 г. з ініцыятывы і нацыянальнага пачуцця паасобных афіцэраў і салдат, што адчувалі і добра разумелі безадкладную патрэбу самаарганізацыі ўсіх беларусаў, дзе б яны не былі, узнік асяродак беларускага руху ў Балтыйскім флоце. Тут разгарнуў працу матрос Васіль Муха, які ў чэрвені 1917 г. заснаваў арганізацыю „Маракоўбеларусаў Балтыйскага флоту", прыцягнуўшы да яе і генералмаёра К. А. Аляксееўскага ў Выбаргу[3]. Месцам заснавання арганізацыі з'яўляўся, верагодна, Гельсінгфорс (цяпер Хельсінкі, Фінляндыя), дзе тады служыў В. Муха. У хуткім часе, да пачатку снежня 1917 г., было моцна сарганізавана больш за 800 матросаў, звязаных „агульным жаданнем пастаяць за родную Беларусь"[4]. На жаль, гісторыя гэтай арганізацыі пакуль мала даследавана[5]. Лепш вядома біяграфія яе заснавальніка.

Васіль Муха нарадзіўся 25 лютага 1889 г. у вёсцы Андрэеўка Рэчыцкага павета Мінскай губерні (цяпер Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці) у сялянскай сям'і. Скончыў Маладушскае народнае вучылішча (Рэчыцкі павет). У 1910 г. прызваны на флот, дзе скончыў яшчэ школу радыетэлеграфістаў у Кранштаце. У першую сусветную вайну знаходзіўся на баявых караблях Балтыйскага флоту ў службе сувязі. З сакавіка 1917 г. член Абласнога камітэта арміі, флоту і рабочых Фінляндыі. Дэлегат шэрагу беларускіх з'ездаў у 1917 г. (гл. ніжэй). Да 1918 г. у ВМФ. У 1918–1920 гг. у Чырвонай Арміі, палітрук радыёсувязі 16-й арміі (Заходні фронт). У 1920–1954 гг. на савецкай і партыйнай працы ў БССР, у тым ліку ў 1932–1933 гг. загадчык Сакратарыята ЦВК

[2] А. К. Каўка, *Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух*, [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі* (далей: *ЭГБ*), т. 1, Мінск 1993, с. 445.

[3] „Вольная Беларусь", 1917, 8 снежня; „Беларуская газэта", 1943, 17 чырвеня.

[4] „Вольная Беларусь", 1917, 8 снежня.

[5] Гл. напр.: У. Калаткоў, *Маракоў-беларусаў Балтыйскага флоту арганізацыя*, [у:] *ЭГБ*, т. 5, Мінск 1999, с. 72.

БССР, у 1944–1946 гг. намеснік старшыні Бабруйскага аблвыканкама. Паводле ўліковых партыйных дакументаў, лічыўся членам КПСС з ліпеня 1917 г. Памёр у 1965 г.[6]

Арганізаваныя маракі-беларусы ў партыйна-палітычных адносінах спачатку належалі да Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), дзейнасць якой аднавілася пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. на неакупіраванай у першую сусветную вайну тэрыторыі Беларусі, а таксама пашырылася за межы краю. Так, у Гельсінгфорсе – тагачаснай галоўнай базе Балтыйскага флоту – існавала арганізацыя БСГ, што аб'ядноўвала каля 200 маракоў[7].

Маракі-ўраджэнцы Беларусі, як і іх армейскія землякі, удзельнічалі ў беларускіх з'ездах, канферэнцыях і сходах, якіх нямала адбылося ў перыяд 1917–1918 гг., а таксама ўваходзілі ў склад шэрагу органаў, што ўзначальвалі і каардынавалі беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Так, матрос Е. А. Мар'янкоў быў членам Беларускага абласнога камітэта пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў, дзе ён прадстаўляў сялян Магілёўскай губерні[8]. На II сесіі Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый, што праходзіла ў Мінску ў кастрычніку 1917 г., сярод большасці дэлегатаў былі не толькі вайскоўцы з дзеючых армій і сяляне, але і прадстаўнікі Гельсінгфорскага флоцкага гарнізона[9]. На 3-м з'ездзе Беларускай сацыялістычнай грамады ў Мінску ў кастрычніку 1917 г. яе гельсінгфорскую арганізацыю прадстаўляў В. Муха, які напрыканцы працы з'езда быў абраны ў склад цэнтральнага камітэта партыі[10]. У гэты ж час на з'ездзе воінаў-беларусаў Заходняга фронту, прадстаўнікоў беларускіх арганізацый 12-й арміі, Балтыйскага флоту і Румынскага фронту (18–24.10/31.10–6.11.1917) таварышам (па-сучаснаму намеснікам) старшыні з'езда быў таксама Муха. У лістападзе 1917 г. ён увайшоў у склад Выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах), у снежні таго ж года быў камісарам аддзела апекі СНК Заходняй вобласці і фронту.

[6] У. Калаткоў, Э. Карніловіч, В. Скалабан, *Муха Васіль Лаўрэнцьевіч*, [у:] *ЭГБ*, т. 5, с. 241.

[7] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), ф. 60, воп. 3, спр. 773, арк. 13.

[8] НАРБ, ф. 60, воп. 3, спр. 175, арк. 72.

[9] Там жа, спр. 81, арк. 18 адв.

[10] А. Луцкевіч, *За дваццаць пяць гадоў (1903–1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацыяў: Беларуская Рэвалюцыйная Грамада, Беларуская Сацыялістычная Грамада*, Вільня 1928, с. 41–43.

Асабліва значным прыкладам палітычнай актыўнасці, а таксама нацыянальнай свядомасці маракоў-беларусаў з'яўляецца іх удзел у працы Усебеларускага з'езда, які адбыўся ў Мінску ў снежні 1917 г. Разам з В. Мухам, які працаваў у ваеннай секцыі з'езда і падтрымліваў ідэю стварэння беларускага войска для абароны краю, тут прысутнічалі матросы Балтыйскага флоту А. Дулін і П. Вярбіцкі. Дулін з'яўляўся адным з чатырох таварышаў старшыні ваеннай секцыі з'езда[11], а Павел Вярбіцкі быў сакратаром на пасяджэннях гэтага прадстаўнічага форуму[12]. На з'ездзе ў ліку прамоўцаў, што найбольш рашуча выступалі за ўтварэнне самастойнай беларускай рэспублікі, быў матрос Дулін[13]. Пасля разгону Усебеларускага з'езда бальшавікамі ўсе тры згаданыя матросы ўвайшлі ў лік сяброў яго Рады, пратэставалі супраць гвалтоўнага зрыву працы з'езда (да іх пратэсту далучыўся і матрос-балтыец Кукушкін), у тым ліку Васіль Муха ў знак пратэсту пакінуў пасаду камісара. У далейшым маракі-беларусы Балтыйскага флоту звязалі свой палітычны лёс з беларускімі секцыямі РКП(б), якія ўтварыліся з былога левага крыла БСГ. Флоцкая арганізацыя, што ўзначальвалася Васілём Мухам, спыніла сваё існаванне, верагодна, у пачатку 1918 г. у сувязі з аднаўленнем незалежнасці Фінляндыі і пераводам караблёў Балтыйскага флоту з Гельсінгфорса ў Кранштат.

Нашы флоцкія суайчыннікі выступалі і з патрабаваннем перагляду або ануляванні несправядлівага для Беларусі Брэсцкага мірнага дагавору 1918 г., аб чым сведчыць рэзалюцыя сходу беларусаў-маракоў Балтыйскага флоту ў Петраградзе ад 13 жніўня 1918 г. (апублікаваная ў газеце „Звезда" за 6 верасня 1918 г.). Але не толькі палітычныя і ваенныя справы цікавілі флоцкіх беларусаў. Яны займаліся і грамадскай дабрачыннасцю. Напрыклад, у Гельсінгфорсе арганізацыя беларусаў-воінаў энергічна збірала сродкі на дапамогу бежанцам і на аб'яднанне беларускіх грамадскіх сіл, даслаўшы частку сродкаў Выканаўчаму камітэту Вялікай беларускай рады (ВБР) для Цэнтральнага беларускага бежанскага камітэта[14]. З падобнай нагоды некалькі пазней бежанская секцыя Усебеларускага з'езда ў газеце „Вольная Беларусь" за 21 снежня 1917 г. выказала падзяку матросам Балтый-

[11] НАРБ, ф. 62, воп. 1, спр. 3, арк. 3.

[12] Там жа, спр. 192, арк. 18.

[13] *Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка (заканчэнне)*, „Беларускі гістарычны часопіс", 1993, № 4, с. 56.

[14] „Белорусская рада", 1917, 29 ноября; НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 21, арк. 26 адв. (карэктура газеты).

скага флоту за прысланыя праз В. Муху ахвяраванні на карысць абяздоленых I-й сусветнай вайной беларусаў-бежанцаў. Таксама ў канцы 1917 г. невялікую грашовую суму (28 рублеў) для ВБР адправіў паштовым пераводам ад імя матросаў-беларусаў, што служылі ў Фінляндыі, А. Шалыга[15].

Такім чынам, у 1917–1918 гг. маракі-беларусы Балтыйскага флоту ў сваёй значнай масе актыўна ўдзельнічалі ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху, у тым ліку ў спробах стварэння беларускага войска, што ім было найбольш блізка як ваеннаслужачым. Геграфічна адарваныя ад Беларусі, яны здолелі арганізацыйна аб'яднацца, ідэнтыфікаваць сябе з пэўнымі беларускімі палітычнымі партыямі і плынямі, імкнуліся ўстанавіць трывалыя сувязі з радзімай, непакоіліся пра яе лёс.

[15] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 19, арк. 39–39 адв.